Кахновіч В. А. Асэнсаванне дваранскага прадпрымальніцтва ў Расійскай імперыі перыяду капіталізму: параўнаўча-генетычнае даследванне гістарыяграфіі / В. А. Кахновіч // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 6 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2011. — С. 207–216.

***В. А. КАХНОВІЧ***

# АСЭНСАВАННЕ ДВАРАНСКАГА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА Ў РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ: ПАРАЎНАЎЧА-ГЕНЕТЫЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

У эпоху Старога Ладу прывілеяванае феадальнае саслоўе займала вядучыя пазіцыі ў жыцці грамадства. У рамках Расійскай імперыі асаблівага росквіту дасягнула дваранства ў другой палове XVIII — першай трэці XIX ст. Нягледзячы на тое што яшчэ да Рэвалюцыі 1917 г. расійскае дваранства ў палітычным і прававым плане заставалася вядучым саслоўем імперыі, пасля прывядзення ў дзеянне Палажэнняў 19 лютага 1861 г. істотным чынам яно змяніла гістарычную сітуацыю. Нельга адмаўляць таго, што памешчыцкая гаспадарка, як і сялянская, крочыла па шляху да капіталістычнай вытворчасці, аднак даводзіцца канстатаваць, што ў гістарыяграфіі даследаванне пытанняў сялянскай гаспадаркі і сацыяльных працэсаў у сялянскім асяроддзі займела перавагу.

Мэта артыкула — тыпалагізаваць сукупнасць гістарыяграфічных уяўленняў у сучаснай расійскай, беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі датычна памешчыцкай гаспадаркі ва ўмовах парэформеннага развіцця ў Расійскай імперыі «перыяду капіталізму» 1861—1914 гг. Азначаная сучасная гістарыяграфія разглядаецца праз прызму генетычнага і структурна-параўнаўчага падыходу, што адпаведна пашырае прадмет даследавання працы. Аб’ектам даследавання з’яўляецца працэс пераемнасці і зменаў (у межах вылучанага прадметнага поля), а таксама праблема мадэрнізацыі памешчыцкай гаспадаркі ва ўмовах фарміравання і развіцця капіталізму. Заўважым, што пад памешчыцкай гаспадаркай і землеўладаннем у гэтым артыкуле разумеецца менавіта толькі гаспадарка і землеўладанне дваран у Расійскай імперыі. Пры гэтым прымаецца да ўвагі тая акалічнасць, што ў гістарычнай рэтраспектыве маёнтак (атаясамляецца з памесцем-вотчынай у дадзеным выпадку) «капіталістычнай эпохі» з’яўляўся ў сваёй пераважнай масе як сацыяльна-гаспадарчы

---

**Кахновіч Віктар Адамавіч** — выкладчык кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук

---



інстытут непасрэдным і гістарычным спадкаемцам маёнтка эпохі феадальнай (дакапіталістычнай). Такім чынам, маем на ўвазе пэўную трывалую сацыяльна-гістарычную і інстытуцыянальную пераемнасць, форму і традыцыю, «гістарычную працягласць».

Так, у дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі вылучаюцца рэвалюцыйны і кансерватыўны накірункі з шэрагам адгалінаванняў: марксісцкая, народніцкая, ліберальна-апазіцыйная і ліберальна-народніцкая літаратура ў рамках першага, у другім жа — ахоўніцкая, умераная і ліберальна-кансерватыўная плыні. У цэлым пераважала і колькасна, і якасна літаратура рэвалюцыйнай скіраванасці, у межах якой гістарычная перспектыва памешчыцкай гаспадаркі выразна абазначалася ў яе знікненні. Да прыкладу, асаблівую ўвагу прыцягвае вялікі пласт разнастайных прац аўтараў народніцкай арыентацыі. Палітычную пазіцыю гэтага кірунку ў пачатку ХХ ст. (партыі эсэраў і народных сацыялістаў, група трудавікоў) выяўляў курс на сацыялізацыю зямлі. Вызначальнай прыкметай прац аўтараў-народнікаў была прыхільнасць да дробнай сялянскай гаспадаркі, што атаясамлялася з «працоўнай гаспадаркай». Напрыклад, А. І. Антановіч лічыў, што буйное (дваранскае, памешчыцкае) землеўладанне і гаспадарка непазбежна крочаць да знікнення, бо ў Расіі не было дастатковых ні прыватных, ні дзяржаўных капіталаў. Разам з тым Антановіч лічыў буйную гаспадарку магчымай толькі ва ўмовах спрыяльнай кан’юнктуры: танная рабочая сіла ў Расіі і высокі попыт на збожжа ў індустрыяльных краінах Еўропы, дзяржаўная пратэкцыя [1, с. 42—52]. Набліжаліся да дадзенага бачання М. П. Аганоўскі, князь А. І. Васільчыкаў, таксама Ф. Бар, М. А. Каблукоў, В. А. Касінскі, І. Мазжухін, Л. В. Ходскі, А. І. Чупроў, А. М. Чэлінцаў, інш. аўтары-народнікі. Прадстаўнікі ліберальнага кірунку (С. М. Пракаповіч, князь П. Д. Даўгарукаў, А. А. Мануілаў, інш. дзеячы) схіляліся, у цэлым, да адчужэння (пераважна за выкуп) прыватнаўласніцкіх зямель на карысць сялян. Варта ўвагі, напрыклад, тое, што ў сваіх артыкулах у зборніку ў 2-х тамах «Аграрный вопрос» (СПб., 1906—1907 гг.) князь П. Д. Даўгарукаў заяўляў проста-такі скрайне рэвалюцыйны падыход аб поўным і неадкладным адчужэнні

дваранскага землеўладання ў Расіі [2]. Цікава, што нават такі прадстаўнік умерана-кансерватыўнай плыні ў вылучанай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі аграрнага пытання ў Расіі, як К. Ф. Галавін («Социализм как положительное явление», нек. інш.), не без ваганняў, але схіляўся да ліквідацыі памешчыцкага землеўладання на карысць сялянскага. Усё гэта дазваляе падзяляць пункт гледжання вядомага эканаміста-даследчыка пачатку XX ст. Бэра Давыдавіча Бруцкуса аб тым, што погляды



адукаваных колаў у Расіі на аграрнае пытанне адрозніваліся на мяжы XIX—XX ст. яўным радыкалізмам [3, с. 11].

Адзначым, што і ў наступным памешчыцкая гаспадарка ў межах гістарыяграфіі ўсяго савецкага часу заставалася маладаследаваным аб’ектам, бо перавага надавалася вывучэнню сялянства і аграрнага руху. Гістарыяграфія перыяду падзяляецца звычайна на два этапы: да канца 1950-х і 1960—1980-х гг. і менавіта да другога этапу адносілася актывізацыя ў вывучэнні дваранства і памешчыцкай гаспадаркі. Вялікае значэнне ў гістарыяграфіі дадзенага перыяду займаюць працы расійскіх гісторыкаў: С. М. Дуброўскага, М. М. Дружыніна, П. А. Зайанчкоўскага, Б. Р. Літвака, П. М. Першына, П. Р. Рындзюнскага, В. К. Яцунскага, А. Р. Аксенюка, У. В. Галабуцкага, І. А. Гуржыя, Л. Г. Мельніка, Д. І. Пойды, М. А. Рубача, П. У. Свянжынскага, П. П. Целічука, В. П. Цяпліцкага, Х. Ю. Бейлькіна, В. М. Бусько, А. І. Кажушкова, Л. П. Ліпінскага, В. П. Панюціча, Э. М. Савіцкага, С. М. Самбук, М. М. Улашчыка, М. Б. Фрыдман, К. І. Шабуні і інш. Даследчыкі гэтага этапу стварылі шэраг фундаментальных прац па сацыяльна-эканамічнай і сацыяльна-палітычнай гісторыі, што хоць і адрозніваліся пранікнёнасцю ідэалогіяй класавай барацьбы і непазбежнай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі, але і адрозніваліся сталым метадалагічным апаратам, грунтаваліся на шырокай базе важнейшых крыніц па пытаннях аграрнага развіцця ў Расійскай імперыі ў парэформенны перыяд і ў пачатку XX ст. Разам з тым пашыранай пазіцыяй было атаясамленне паняццяў «памешчыцкая» і «прыгонніцкая гаспадарка». Характэрна, напрыклад, што С. М. Дуброўскі, з аднаго боку, вызнаваў перавагу ў Расіі недасканалага памешчыцкага або «прускага» шляху ў капіталістычным развіцці сельскай гаспадаркі, аднак, з другога, атаясамляў памешчыцкую гаспадарку з «прыгонніцкай» [4].

Галоўнай перашкодай у капіталістычным развіцці Расіі прызнаваліся прыгонніцкія перажыткі: памешчыцкае землеўладанне як з’ява, латыфундызм (буйное землеўладанне ад 500 дзес.), адпрацоўкі, іспольшчына, кабальныя ўмовы найму, сервітуты (для заходніх тэрыторый імперыі), вясковая абшчына, самадзяржаўе. Апроч таго, што з’яўляецца пашыранай характэрнай рысай гістарыяграфіі савецкага часу, памешчыцкая гаспадарка стала атаясамлялася ў аналітычных выкладках з гаспадаркай прыватнаўласніцкай у цэлым, што можам прасачыць у працах С. М. Дуброўскага, Н. А. Егіазарава, І. Д. Кавальчанкі, М. А. Рубач, К. І. Шабуні і інш. Адзначым з усёй неабходнасцю, што атаясамленне «памешчыцкай» і «прыватнаўласніцкай гаспадаркі» было ўспрынята і



захавалася ў сучаснай расійскай гістарыяграфіі. Варта ў гэтым дачыненні звярнуць увагу на працы П. П. Полха, П. І. Савельева, І. Д. Кавальчанкі і шэрагу аўтараў 1990-х гг. Напэўна, у дадзеным дачыненні маем справу з асаблівай жывучасцю народніцкіх падыходаў, што знайшлі сваю своеасаблівую рэцэпцыю ў сучаснай літаратуры па праблеме.

Агульна прызнаецца, што пасля скасавання прыгоннага права дваранства ў Расіі спазнавала страту сацыяльных, эканамічных і палітычных пазіцый у грамадстве. Гэты працэс з’яўляўся складовай часткай шматгранных з’яў мадэрнізацыі грамадства ў Расійскай імперыі, мадэрнізацыі — структурнай грамадскай трансфармацыі, вызначэнне якой застаецца праблемным у сацыяльных навуках. У рамках дадзенай працы мадэрнізацыя разглядаецца як працэс пераходу ад аграрнага да індустрыяльнага грамадства (магчыма, з улікам пераходных стадый, ад феадальнага да капіталістычнага). У гістарыяграфіі (А. М. Анфімаў, Л. П. Ліпінскі, В. П. Панюціч, В. П. Цяпліцкі, Н. Р. Цямірава і інш.) звычайна адзначаліся наступныя знешнія (тэхналагічныя) рысы пераўтварэнняў у маёнтках: пашырэнне шматпольных і пладазменных севазваротаў, травасеяння, бульбаводства; цукровых буракоў і іншых тэхнічных культур, спецыялізаванай таварнай жывёлагадоўлі (малочнай, мясной, племяннай); увядзенне ў гаспадарчую практыку ўдасканаленых прылад працы; звяртанне да прамысловай і гандлёвай дзейнасці. З пункту ж гледжання выяўлення змен у грамадскіх (вытворча-арганізацыйных) адносінах працяглы час выкарыстоўвалася мадэль, якая фіксавала пераход ад паншчыннай (затым — адпрацовачнай) формы гаспадарання да капіталістычнай. На сучасным жа этапе, найперш у расійскай гістарыяграфіі (І. М. Лешчанка, Р. В. Федасееў, В. М. Нікулін, К. М. Куркоў і інш.), вылучаецца пераход ад тыпу гаспадарання ў маёнтках, што заснаваны на традыцыйнай сістэме гаспадарання, да інавацыйных маёнткаў — з рацыянальнай аграрнай альбо тэхнічнай (прамысловае прадпрыемства ў цэнтры гаспадарчай сістэмы маёнтка) таварнай вытворчасцю. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі развівае падобныя падыходы ў вывучэнні гісторыі памешчыцкай гаспадаркі на беларускім і ўкраінскім матэрыяле В. А. Кахновіч (дысертацыя «Гаспадаранне ў маёнтках Палескага рэгіёна Расійскай імперыі ў 1861—1914 гг.», абароненая ў сакавіку 2010 г., таксама яго асобныя артыкулы).

Звяртаючыся да праблем мадэрнізацыі і прадпрымальніцтва ў маёнтках, адзначым, што найбольш выразна працэсы мадэрнізацыі і эканамічнай (сацыяльнай) магутнасці памешчыкаў (дваран-землеўласнікаў) увасабляюцца ў дынаміцы землеўладання. Такая форма дыягностыкі



гістарычных працэсаў шырока прызнана ў гістарыяграфіі яшчэ дарэвалюцыйнай і стала класічнай формай у савецкі час.

Так, вядома, што найбольш магутная землеўласніцкая (памешчыцкая) частка саслоўя згубіла з 1862 г. па 1909 г. да 48 % зямлі. Аднак трэба ўлічваць, што па стану на 1905 г. яна валодала (у еўрапейскай частцы краіны) да 55 млн дзесяцін зямлі, або 62 % ад усёй прыватнай зямельнай уласнасці ў Расіі. Гэта складала ў агульным зямельным фондзе ў рамках 50 губерань Еўрапейскай Расіі 13,4 % і належала прыкладна 30 тыс. уласнікам маёнткаў [11, с. 166—167].

Адрознівалася сітуацыя на захадзе Расійскай імперыі. Так, у 1905 г. дваране валодалі 7,5 млн дзесяцін, або 41 % да ўсёй зямлі і звыш 85 % да прыватнаўласніцкай зямлі ў межах 5 беларускіх губерань [7, с. 254—255]. Падобнае ж было становішча на ўкраінскіх землях, асабліва на Правабярэжнай Украіне, а таксама ў Прыбалтыцы і Царстве Польскім (Прывісленскім краі). Супыняючыся на гэтым аспекце, заўважым выразную спецыфіку ў гістарычным развіцці на тэрыторыі Беларусі і Правабярэжнай Украіны, Літвы, Царства Польскага, дзе ўрад ажыццяўляў шэраг рэпрэсіўных захадаў у дачыненні да мясцовага т. зв. «польскага» дваранства. Таму самая сітуацыя нечаканая, калі, паводле А. П. Жытко, вага мясцовага дваранства беларускіх зямель адносна агульнага дваранскага землеўладання ў еўрапейскай частцы Расіі не зменшылася, а вырасла за 1862—1909 гг. з 13,1 да 18,1 % [8, л. 90]. Апошняе сведчыла аб пэўнай гаспадарчай устойлівасці мясцовага дваранства, на што звяртаецца ўвага Анатолем Паўлавічам, і шырока фіксавалася цэлым шэрагам прадстаўнікоў беларускай гістарыяграфіі (Э. М. Савіцкі, В. П. Панюціч, К. І. Шабуня, Л. П. Ліпінскі і інш.). Адзначалася (В. П. Цяпліцкі, Д. Бавуа, Д. І. Пойда і інш.) падобная сітуацыя і на Правабярэжнай Украіне.

Акрэсліваючы агульную сітуацыю ў гістарыяграфіі, адзначым, што даследаванне праблем сацыяльнай і эканамічнай гісторыі, аграрнага пытання шырока прадстаўлена ў ёй. Аднак як у літаратуры дарэвалюцыйнага часу, так і — у большай меры — у гістарыяграфіі савецкага часу галоўная ўвага надавалася вывучэнню праблем сялянскай гаспадаркі. Ужо адзначаліся вышэй зрухі ў савецкай гістарыяграфіі 1960—1980-х гг. На новы ўзровень выйшла гістарыяграфія ў канцы XX — пачатку XXI ст.

Так, у расійскай гістарыяграфіі яшчэ ў 1960—1970-я гг. выявілася процістаянне двух падыходаў: 1) А. М. Анфімаў, Л. П. Мінарык і інш. даследчыкі адстойвалі палажэнне аб перавазе ў Расіі недасканалага памешчыцкага або «прускага» шляху ў капіталістычным развіцці сель-



скай гаспадаркі; 2) І. Д. Кавальчанка, Л. І. Бародкін, П. Р. Рындзюнскі, Б. Р. Літвак і інш. даследчыкі адстойвалі палажэнне аб узрастаючай ролі сялянскай гаспадаркі, «амерыканскага» або «сялянскага» шляху ў развіцці аграрнага сектара краіны пры ўбываючым значэнні памешчыцкай гаспадаркі [11, с. 23—25; 18, с. 7]. У 1960-я гг. П. Р. Галуза адстойваў цікавы тэзіс аб тым, што ў Расіі меў месца асаблівы тып ваенна-феадальнага імперыялізму — «акцябрыскага капіталізму». Яго вызначальнымі рысамі былі: пераважная роля дзяржавы ў мадэрнізацыйных працэсах, «дыктатура прыгоннікаў-памешчыкаў» і пашырэнне капіталізму «ўшыр», а не «ўглыб» [6, с. 13—21]. Прымання ў савецкай гістарыяграфіі дадзеная пазіцыя не знайшла, тым болей што палажэнні Галузы абапіраліся толькі на прыклад Туркестана. Разам з тым у працах А. М. Анфімава, Л. П. Мінарык, Д. І. Будаева і ўкраінскага даследчыка Я. М. Гуменюка на базе вывучэння асобных (лакальных) прыкладаў гаспадарання вывучалася развіццё капіталізму ў маёнтках «углыб».

Аднак, звяртаючыся да расійскай гістарыяграфіі 1990-х — пачатку XXI ст., сутыкаемся з новай сітуацыяй. Так, як вынік супрацьборства пазіцый, што былі заяўлены яшчэ ў ранейшы час, у расійскай гістарыяграфіі ў 1990_я гг. перамагло палажэнне аб гістарычнай перспектыве ва ўмовах Расіі пасля рэформы 1861 г. менавіта «сялянскага тыпу аграрнай эвалюцыі», што адлюстравана ў працах І. Д. Кавальчанкі [11, с. 146, 313; 12, с. 35—38], А. П. Карэліна [16, с. 31, 35], П. І. Савельева [18, с. 37, 40], Н. Б. Селунскай [19, с. 163], П. П. Полха [17, с. 8—9], таксама ў працах П. С. Кабыткова, Б. Р. Літвака, А. Я. Аўрэха і інш. даследчыкаў. П. І. Савельеў на прыкладзе Паволжа ў XIX ст. з дапамогай кластэрнага аналізу статыстычных даных вылучыў 3 тыпы аграрнага развіцця: 1) памешчыцкі; 2) сялянскі; 3) фермерскі. Калі пры першым назіралася перавага памешчыцкага землеўладання і пасеваў у прыватным зямельным фондзе, то пры іншых пераважалі сялянскае землеўладанне і гаспадарка, прычым пры фермерскім тыпе — менавіта прыватнаўласніцкае сялянскае землеўладанне і гаспадарка. Савельеў адмаўляў для Паволжа магчымасць «прускага» шляху — прызнаваў магчымым толькі «амерыканскі» шлях на рускай сялянскай аснове і ідэалізаваў своеасаблівы «рускі сялянскі лад» [18, с. 39]. Апошні вызначаўся ім як сялянская цывілізацыя, адрозная і процілеглая індустрыяльнай цывілізацыі, пабудаваная на традыцыйных каштоўнасцях, «сямейна-працоўнай эканоміцы» [18, с. 14, 34, 37]. Паводле Савельева, толькі каапераცыя сялянскіх сямейна-працоўных гаспадарак магла забяспечыць паспяховае

гаспадарчае развіццё Расіі [18, с. 40]. Падобныя ж пазіцыі ў П. П. Полха, што даследаваў памешчыцкую гаспадарку ў Ноўгарадскай губерні ў канцы XIX ст. Ён выявіў: большая частка памешчыкаў не мела ахвоты да гаспадарчых спраў і прадавала свае землі, аднак новыя ўласнікі (купцы, мяшчане, іншаземцы, сяляне, дваране, што раней не валодалі зямлёй) успадкавалі ад ранейшых уласнікаў іх спосабы арганізацыі вытворчасці (адпрацоўкі, перадача зямлі ў арэнду сялянам на кабальных умовах) і не здолелі ў цэлым стварыць паспяховых гаспадарак [17, с. 22—23]. Разам з тым П. П. Полх лічыў, што рынкавае развіццё вяло да поспеху менавіта сялянскую гаспадарку, а не памешчыцкую, хоць за апошняй ён, агульна, эканамічнай перспектывы не адмаўляў [17, с. 5, 8—9].

Палажэнне аб перамозе ў Расіі капіталістычнага развіцця ў аграрным сектары на базе сялянскай гаспадаркі знайшло сваё пашырэнне не толькі ў расійскай гістарыяграфіі, але знаходзім яго і ў навейшай беларускай [5, с. 70, 179—223], а таксама ва ўкраінскай [14, с. 87—107] гістарыяграфіі. Адрозную пазіцыю можам адшукаць толькі ў асобных аўтараў пазнейшых прац па праблеме (В. М. Нікулін, Р. У. Федасееў і інш.). Разам з тым, звяртаючыся да навуковай спадчыны І. Д. Кавальчанкі, з усёй неабходнасцю адзначым, што ён адасабляў ад агульнарасійскай сітуацыю ў заходніх рэгіёнах імперыі, дзе існавала высокая ступень таварнасці (1/2 і больш) прадукцыі маёнткаў, а Беларускі і Прыуральскі раёны прыводзяцца ім як прыклады ўстойлівасці дваранскага (памешчыцкага) землеўладання [11, с. 146, 169]. Падкрэслім, што больш высокая ступень таварнасці магла прама ўказваць на адносную паспяховасць дваранскай прадпрымальніцкай гаспадаркі. Апошняе знаходзіла поўнае разуменне ў беларускай і ўкраінскай (у меншай меры) гістарыяграфіях яшчэ савецкага этапу, захоўвае сваю падтрымку ў іх і на сённяшні час. Усё больш заяўляе аб сабе на сучасным этапе імкненне даследчыкаў узважана, цвяроза і сістэмна разгледзець праблемы мадэрнізацыі гаспадаркі ў маёнтках.

Так, сучасны расійскі гісторык К. М. Куркоў даказаў, што адаптацыя памешчыкаў да новых умоў адбывалася з пераменным поспехам, але дваранства ў Расіі губляла гістарычную ініцыятыву, галоўную ролю ў жыцці грамадства, бо саслоўнае заканадаўства, што падтрымоўвалася дзяржавай, тармазіла паспяховае прыстасаванне дваранства да капіталізму [11, л. 311, 313]. Куркоў вылучыў наступныя галоўныя рысы дваран-прадпрымальнікаў: 1) прыналежнасць да вышэйшай і сярэдняй праслойкі дваранства; 2) наяўнасць стартавага капіталу; 3) спецыялізацыя на перапрацоўцы сельскагаспадарчай і мінеральнай сыраві-



ны — рэсурсаў уласных маёнткаў; 4) цягаценне да крыніц даходаў у невытворчай сферы і «… определенная тенденция некоторой части дворянства к паразитированию» [13, л. 309—310]. Аб выключнай ролі праслойкі буйнейшых латыфундыстаў Расіі не толькі ў землеўладанні, але і гандлёва-прамысловай дзейнасці пісалі яшчэ ў савецкі час Л. П. Мінарык, А. М. Анфімаў, іншыя даследчыкі. Між тым толькі ў канцы XX —пачатку XXI ст. вывучэнне дваранскага прадпрымальніцтва набыло пашырэнне як у расійскай, так і беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі вядомасць набыло палажэнне беларускага гісторыка А. П. Жытко: «Дваране Беларусі ў цэлым паспяхова адказалі на выклікі часу. Для іх уласцівай была ўспрымальнасць да навін у агратэхніцы і агракультуры», «Не будзе перабольшваннем, калі скажам, што значная частка дваран, а латыфундысты і ўвогуле ўсе, у сваёй земляробчай дзейнасці арыентаваліся перш за ўсё на перадавы вопыт заходніх краін. Мэта — падняць даходнасць сваіх гаспадарак, а не проста выжыць» [9, с. 32]. Аб перавазе капіталістычных метадаў гаспадарання ў маёнтках на Беларусі ўжо ў 1870_я гг. пісаў таксама беларускі гісторык В. П. Панюціч [15]. Іншы беларускі гісторык А. Л. Кіштымаў звярнуў увагу на тую акалічнасць, што мясцовыя «польскія» памешчыкі атрымалі як бы своеасаблівы рэванш у эканамічнай сферы за той усціск, ганенні і абмежаванні, што адчувалі яны ў прававой, палітычнай і нацыянальна-культурнай сферы [10]. Буйнейшы ж сучасны ўкраінскі даследчык памешчыцкай праблематыкі Н. Р. Цемірава ў сваёй доктарскай дысертацыі (Данецк, 2003 г.) даказала, што памешчыцкая гаспадарка шмат у чым зрабіла пазітыўны ўплыў на сялянскую праз пашырэнне палепшанага інвентару і сельскагаспадарчых машын, насення і парод племянной жывёлы і выконвала, такім чынам, асаблівую культуртрэгерскую ролю ў аграрным сектары краіны [20, с. 26].



ходы ў ацэнцы перспектыў парэформеннага маёнтка. Падсумоўваючы агляд гістарыяграфіі па праблеме, адзначым, што памешчыцкая гаспадарка адносна сялянскай стварала ў заходніх абласцях імперыі рэальную эканамічную перспектыву ў выніку пераўвасаблення ў буйныя капіталістычныя аграрныя гаспадаркі. Аднак з-за шэрагу прычын рэалізаваць гэты свой патэнцыял у асноўнай масе маёнткі заходніх рэгіёнаў імперыі, як і ў цэлым у Расійскай імперыі, не здолелі. Высвятленне ж прычын апошняга (як знешніх, так і ўнутраных) абазначана як задача далейшых даследаванняў. У кантэксце вышэйсказанага адзначым таксама, што вылучаная тэндэнцыя ў постсавецкай расійскай гістарыяграфіі да ідэалізацыі гістарычнага месца, ролі і перспектыў сялянскай гаспадаркі ў Расіі напярэдадні Рэвалюцыі 1917 г. часткова пераадольваецца ў

навейшых працах расійскіх аўтараў. Мяркуем, што — з уласна эканамічных прадпасылак — менавіта маёнтак меў істотна большыя магчымасці да арганізацыі паспяховай і прадпрымальніцкай аграрнай гаспадаркі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. *Антонович, А. И.* Вопросы земледельческой промышленности и дворянского землевладения в России / А. И. Антонович. М. : Тип. Тов-ва А. И. Мамонтова, 1898. 98 с.

2. *Долгоруков, П. Д.*, князь. Аграрный вопрос с точки зрения крупного землевладения / П. Д. Долгоруков, князь // Аграрный вопрос: сб. ст.: в 2 т. / Издание кн. П. Д. Долгорукова и И. И. Петрункевича. М., 1906—1907. Т. 1. 1906. С. 1—9.

3. *Бруцкус, Б. Д.* Аграрный вопрос и аграрная политика / Б. Д. Бруцкус. Пг. : Изд-во «Право», 1922. 235 с.

4. *Дубровский, С. М.* Сельское хозяйство и крестьянство России в период империализма / С. М. Дубровский. М. : Наука, 1975. 398 с.

5. *Бейлькин, Х. Ю.* Капиталистическая трансформация сельского хозяйства Беларуси в начале XX века (1901—1914 гг.) / Х. Ю. Бейлькин. Гомель : Центр исследований институтов рынка, 2006. 296 с.

6. *Галузо, П. Г.* Аграрные отношения на юге Казахстана в 1867—1914 гг. / П. Г. Галузо. Алма_Ата : Наука, 1965. 345 с.

7. Гісторыя БССР: у 5 т. / рэдкал.: І. М. Ігнаценка (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Навука і тэхніка, 1972—1975. Т. 2: Беларусь у перыяд капіталізму (1861—1917 гг.) / К. І. Шабуня [і інш.]. 1972. 688 с.Гісторыя БССР. Т. 2. С. 259.

8. *Жытко, А. П.* Дваранства ў сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі перыяду капіталізму. 1861—1914 гг.: дыс. … д-ра гіст. навук: 07.00.02 / А. П. Жытко. Мінск, 2000. 290 л.

9. *Жытко, А. П.* Дваранства ў сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі перыяду капіталізму. 1861—1914 гг.: аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук: 07.00.02 / А. П. Жытко; БДПУ. Мінск, 2000. 39 с.

10. *Киштымов, А. Л.* Экономический потенциал белорусской усадьбы в конце XVIII — начале XX века / А. Л. Киштымов // Исторические усадьбы Беларуси: состояние и перспективы: материалы Междунар. конф., Залесье, 4—5 сент. 2003 г. / Национальная комиссия Республики Беларусь по делам ЮНЕСКО, Мин-во культуры РБ [и др.]. Минск, 2003. С. 90—123.



11. *Ковальченко, И. Д.* Аграрный строй России второй половины XIX — начало XX в. / И. Д. Ковальченко. М. : РОССПЭН, 2004. 504 с.

12. *Ковальченко, И. Д.* Два пути аграрной эволюции в Европейской России (опыт многомерного типологического анализа) / И. Д. Ковальченко, Л. И. Бородкин // Аграрная эволюция в России и США в XIX — начале XX века: материалы советско-американских симпозиумов / МГУ [и др.]; отв. ред. И. Д. Ковальченко и В. А. Тишков. М., 1991. С. 18—38.

13. *Курков, К. Н.* Российское дворянство в контексте модернизации в начале XX века: Экономический и социальный аспекты: дис. … д-ра ист. наук: 07.00.02 / К.Н. Курков. М., 2006. 434 л.

14. *Панченко, П. П.* Аграрна історія України / П. П. Панченко [и др.]; за ред. П. П. Панченко. 3-е вид. Київ : Просвіта, 2007. 532 с.

15. *Панюціч, В. П.* Сацыяльна-эканамічная арганізацыя панскай гаспадаркі Беларусі (60—70_я гады XIX ст.) / В. П. Панюціч // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманіт. навук. 2006. № 4. С. 68—73.

16. Первая революция в России: взгляд через столетие / А. П. Корелин [и др.]; под ред. А. П. Корелина. М. : Памятники историч. мысли, 2005. 602 с.

17. *Полх, П. П.* Помещичье хозяйство Новгородской губернии в конце XIX века: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / П. П. Полх; Новгородский гос. ун-т им. Ярослава Мудрого. Великий Новгород, 2001. 25 с.

18. *Савельев, П. И.* Пути аграрного капитализма в России. XIX век (по материалам Поволжья): автореф. … д-ра ист. наук: 07.00.02 / П. И. Савельев; Уральский гос. Ун-т им. А. М. Горького. Екатеринбург, 1995. 42 с.

19. *Селунская, Н. Б.* Производственно-технический уровень и наемный труд в крестьянском и помещичьем хозяйстве Европейской России / Н. Б. Селунская // Аграрная эволюция в России и США в XIX — начале XX века: материалы советско-американских симпозиумов / отв. ред. И. Д. Ковальченко и В. А. Тишков. М. : Наука, 1991. С. 153—173.

20. *Темірова, Н. Р.* Соціально-економічна еволюція поміщицтва України в 1861—1917 рр.: автореф. дис. … д-ра іст. наук: 07.00.01 / Н. Р. Темірова; Донецький держ. ун-т.

Донецьк, 2003. 36 с.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 22 лютага 2010 г.